ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Дзінгілеўскай Алены Іванаўны "Словаўтваральная сінанімія і паранімія прыметнікаў у беларускай літаратурнай мове", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыйная праца А. І. Дзінгілеўскай прысвечана актуальнай праблеме ў беларускім мовазнаўстве – даследаванню аднаасноўных вытворных прыметнікаў, якія выяўляюць адносіны семантычнай тоеснасці, блізкасці або адрознення. Нягледзячы на тое, што праблематыка словаўтваральнай сінанімii асвятлялася многімі мовазнаўцамі, сёння распрацоўкі патрабуюць крытэрыі размежавання словаўтваральных сінонімаў і паронімаў сярод аднаасноўных ад'ектыўных утварэнняў, пытанні аб спосабах і шляхах фарміравання сінанімічных і паранімічных аб'яднанняў ад'ектыўных дэрыватаў.

Асноўнай мэтай працы, па вызначэнні дысертанткі, стала выяўленне словаўтваральнага патэнцыялу беларускай літаратурнай мовы ў сферы ўтварэння аб'яднанняў аднаасноўных ад'ектыўных дэрыватаў і сістэматызацыя гэтых аб'яднанняў паводле характару семантычных і стылістычных адносін паміж імі.

Аналіз моўнага матэрыялу (917 пар і 198 шматкампанентных аб'яднанняў) і характарыстыка атрыманых вынікаў праводзіцца на высокім навуковым узроўні, што пацвярджае належную кваліфікацыю дысертанткі, сведчыць аб яе ўменні самастойна інтэрпрэтаваць і ацэньваць моўныя факты. А. І. Дзінгілеўская адзначае, што аднаасноўныя прыметнікі фарміруюць пары і шматкампанентныя аб'яднанні, у межах якіх ад'ектыўныя ўтварэнні ўступаюць у адносіны або сінанімii, або паранімii, а ў шматкампанентных аб'яднаннях – і сінанімii, і паранімii. У аўтарэфераце прадстаўлена змястоўная інфармацыя аб даследаванні сінанімічных і паранімічных адносін паміж аднаасноўнымі прыметнікамі.

Праведзенае даследаванне дазволіла дысертантцы зрабіць высновы аб тым, што словаўтваральны патэнцыял беларускай літаратурнай мовы ў галіне суфіксальнага ўтварэння ад'ектыўнай лексікі характарызуецца актыўным утварэннем прыметнікаў ад адной асновы слоў розных часцін мовы. Абгрунтаванасць і дакладнасць асноўных вынікаў даследавання забяспечаны ўсебаковым аналізам фактычнага матэрыялу з

прымяненнем апісальнага метаду, метаду словаўтваральнага аналізу, метаду кампанентнага аналізу, метаду колькаснага падліку.

Несумненна, атрыманыя вынікі і асноўныя палажэнні дысертацыйнай працы маюць навуковую вартасць і будуць садзейнічаць далейшаму вывучэнню прыметнікаў, а таксама распрацоўцы пытанняў словаўтваральнай сінанімії і паранімії. Вынікі дысертацыйнага даследавання і сабраны фактычны матэрыял знойдуць прымяненне пры складанні вучэбных дапаможнікаў па сучаснай лексікалогіі і словаўтварэнні, пры выкладанні курса беларускай мовы ў вышэйшых навучальных установах, пры правядзенні спецкурсаў і спецсемінараў па сучаснай лексікалогіі і словаўтварэнні.

Аўтарэферат сведчыць, што дысертацыйнае даследаванне “Словаўтваральная сінанімія і паранімія прыметнікаў у беларускай літаратурнай мове” ўяўляе сабой цэласнае, актуальнае, самастойнае даследаванне, утрымлівае новыя навукова абгрунтаваныя вынікі. Лічу, што яго аўтар А. І. Дзінгілеўская заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Вядучы навуковы супрацоўнік
аддзела гісторыі беларускай мовы
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі
кандыдат філалагічных навук Э. В. Ярмоленка

01.10.2026 г.

Подпіс Ярмоленка Э.В.
СВЕДЧУ
Вядучы спецыяліст па кадрах
Н.В. Паўлава
01 10 2026